# Польская Армія Краёва: гісторыя і міфы*




Кніга ўяўляе сабой зборнік навуковых артыкулаў польскіх, германскіх, беларускіх, амерыканскіх і англійскіх аўтараў, якія разглядаюць сутнасць складанага працэсу асэнсавання праблемы польскай Арміі Краёвай, або польскай Айчыннай Арміі, у яе гісторыі часоў другой сусветнай вайны.

У прадмове кіраўніка Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме доктара Й.Дуплера адзначаецца, што ўпершыню шырокай нямецкамоўнай аўдыторыі сталі даступны вынікі польска-беларускіх і англійска-амерыканскіх даследаванняў праблемы.

Ва ўступным артыкуле "Айчынная Армія ў люстраным адлюстраванні польскай нацыянальнай ідэнтычнасці" нямецкі даследчык Б.К'яры спыняецца на гістарычных і гістарыяграфічных аспектах гісторыі Арміі Краёвай, кіраўніцтва якой у гады другой сусветнай вайны ажыццяўляў польскі эміграцыйны ўрад спачатку з Францыі, а потым з Лондана. Менавіта з гэтай амаль што 400-тысячнай арміяй звязана гісторыя польскага ваеннага супраціўлення. Б.К'яры канстатуе, што Армія Краёва аб'яднала значную частку палітычна разрозненых падпольных арганізацый і "стала сінонімам ваенных поспехаў польскага падполля". Калі да 1943 г. формамі барацьбы падпольнай арміі былі дыверсіі і разведка, дык на заключным этапе вайны ўжо дзейнічалі значныя вайсковыя фарміраванні. Б.К'яры ставіць пытанне: у чым заключаецца значэнне Арміі Краёвай для польскага грамадства ў ваенным і палітычна-маральным аспекце? Адказваючы на гэтае і іншыя пытанні, германскі даследчык адзначае, што "складаным і па сённяшні дзень застаецца стаўленне палякаў да вызначальнай тэмы сваёй ваеннай гісторыі XX стагоддзя".

На думку аўтара, у прапанаваных артыкулах размова ідзе не столькі пра нейкі адзін аспект польскай гісторыі, колькі пра стаўленне да яе, а таксама пра тое, якую ролю адыгралі міфы пра Армію Краёву ў гісторыі Польскай рэспублікі і посткамуністычнай Польшчы, а таксама ў нацыянальнай самасвядомасці і ў афіцыйнай дзяржаўнай інтэрпрэтацыі.

Першы раздзел — "Польская Айчынная Армія і яе ваенна-гістарычнае поле" (с. 29—299) — уключае матэрыялы, якія акрэсліваюць гістарычныя, арганізацыйна-структурныя і ваенныя рамкі праблемы. Пачынаецца раздзел з артыкула прафесара Фрайбургскага ўніверсітэта Б.Марціна "Бар'еры — масты — барыкады. Гістарычныя перспектывы нямецка-польскага суседства ў XIX—XX стагоддзях". Разглядаючы гісторыю адносін дзвюх краін і народаў, аўтар прыходзіць да высновы пра неабходнасць сумесных намаганняў для пераадолення "нацыянальна абгрунтаваных і гістарычна замацаваных ментальных бар'ераў".

Навуковы супрацоўнік Нямецкага інстытута ў Варшаве Г.-Ю.Бёмельбург аналізуе германскую палітыку на акупіраванай тэрыторыі Польшчы ў 1939—1945 гг. зыходзячы з агляду літаратуры і вызначае новыя тэндэнцы ў даследаванні германскай акупацыйнай палітыкі на тэрыторыі Польшчы ў гады другой сусветнай вайны. Навуковы супрацоўнік Польскай акадэміі навук В.К.Раман прапануе чытачу гістарычны агляд палітыкі Савецкага Саюза ў дачыненні да ўсходніх тэрыторый Польскай рэспублікі, ці "крэсаў усходніх", у 1939—1941 гг. Аўтар падрабязна паказвае гістарычныя

* Die polnische Heimatarmee: Geschichte und Mythos der Armia Krajowa seit dem Zweiten Weltkrieg. Im Auftrag des Militargeschichtlichen Forschungsamtes herausgegeben von *Bernhard Chiari* unter Mitarbeit *von Jerzy Kochanowski*. R.Oldenbourg Verlag. Muenchen, 2003. — 948 S.

этапы правядзення палітыкі “савецкай акупацыі” пасля 17 верасня 1939 г., характарызуе яе на прыкладзе саветызацыі ўсходніх ваяводстваў, раскрывае сутнасць грамадскай перабудовы, паказвае супраціўленне і тэрор на анексіраваных тэрыторыях, разглядае асаблівасці дэпартацыі насельніцтва, а таксама выяўляе перспектывы існавання акупіраваных і анексіраваных польскіх тэрыторый. Б.Марцін і Г.-Ю.Бёмельбург засяроджваюць увагу на неабходнасці аб'ектыўнага разгляду ўсіх прычын стварэння Арміі Краёвай, яе рашучай барацьбы супраць акупантаў і захавання ў памяці польскага народа пасля другой сусветнай вайны.

Прафесар Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве Г.Мазур у артыкуле “Саюз узброенай барацьбы — Айчынная Армія” падрабязна спыняецца на гісторыі фарміравання вайсковай арганізацыі, разглядае розныя ўзброеныя фарміраванні, асновай якіх з'яўляліся ўкамплектаваныя падраздзяленні колькасцю ад 35 да 54 чалавек. Асновай тэрытарыяльнай структуры Арміі Краёвай былі акругі, непасрэдна падпарадкаваныя галоўным камендатурам у Варшаве, Кракаве, Познані, Львове. Знаходзячыся ў падполлі, Армія Краёва з'яўлялася часткай Войска Польскага, падпарадкаванага эміграцыйнаму ўраду. У артыкуле М.Ной-Крвавіча паказана храналогія мерапрыемстваў польскага эміграцыйнага ўрада па кіраўніцтву Арміяй Краёвай. Служба інфармацыі і разведкі гэтай ваеннай арганізацыі адыгрывала вельмі важную ролю ў барацьбе, якую пачалі весці на акупіраванай польскай тэрыторыі яе мясцовыя канспіратыўныя структуры. Цікавасць чытача могуць выклікаць звесткі пра супрацоўніцтва польскай падпольнай разведкі і службаў брытанскай разведкі, якія інфармавалі брытанскі ўрад пра стварэнне Германіяй найноўшага ракетнага ўзбраення.

Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Паморскай педагагічнай акадэміі П.Калакоўскі даследуе пытанне аб барацьбе савецкіх службаў разведкі і дзяржаўнай бяспекі супраць польскага падполля на працягу 1939—1945 гг. Разгляд гэтага пытання праводзіцца паэтапна: спачатку ва ўмовах “саветызацыі 1939—1941 гг.”, потым, пасля нападзення Германіі на Савецкі Саюз, на прыкладах “барацьбы супраць незалежнага польскага падполля”, выяўлення ролі польскага камуністычнага падполля і, у рэшце рэшт, пасля разгрому Чырвонай Арміяй “польскай падпольнай дзяржавы”. Даследчык заключае, што савецкім службам контрразведкі (СМЕРШ) і дзяржаўнай бяспекі спатрэбілася каля трох месяцаў — са студзеня да сакавіка 1945 г. — для амаль што поўнай яе ліквідацыі. Увогуле за перыяд з лета 1944 г. да канца вясны 1945 г. савецкімі службамі бяспекі і СМЕРШам былі арыштаваны 50 тыс. салдат Арміі Краёвай.

Вышэйшай кропкай “антынямецкага супраціўлення палякаў у гады другой сусветнай вайны” прафесар Варшаўскага ўніверсітэта У.Барадзей лічыць Варшаўскае паўстанне, якое доўжылася з 1 жніўня да 2 кастрычніка 1944 г. Правесці дакладныя падлікі ахвяр Варшаўскага паўстання практычна немагчыма, але размова можа ісці пра 150—180 тыс. чалавек, сярод якіх амаль што 90 працэнтаў былі мірныя грамадзяне. На думку аўтара, прычыны паражэння Варшаўскага паўстання неабходна шукаць “не ў ваеннай, а ў палітычнай сферы”. Другой цэнтральнай ваеннай аперацыяй Арміі Краёвай Г.Мазур лічыць аперацыю “Бура”, якая пачалася ў лістападзе 1943 г. і доўжылася да канца 1944 г. ва ўсіх раёнах Польшчы. Яна была падрыхтавана і скаардынавана, але не дасягнула пастаўленай мэты. Хоць абедзве аперацыі і пацярпелі паражэнне, аднак менавіта гэтыя падзеі застаюцца найбольш значнымі для “самавызначэння пакалення ваеннага супраціўлення”.

На ход ваенных вынікаў, як адзначае Г.Мольдэнхаўэр, аўтар апошняга артыкула першага раздзела, значны ўплыў аказвалі дзейнасць савецкіх органаў НКУС, іх адносіны з Арміяй Краёвай. Разглядаючы падзеі з ліпеня 1944 да чэрвеня 1945 гг., аўтар спыняецца на пытаннях савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы на заключным этапе вайны, раззбраення і інтэрніравання Арміі Краёвай, расказвае пра формы і маштабы барацьбы НКУС з польскай падпольнай арміяй, пра “чыстку” новых польскіх органаў улады ад “акаўцаў” і пра “маскоўскі працэс” супраць 16 кіраўнікоў падпольнай Арміі Краёвай.

Другі раздзел кнігі — “Ваенная паўсядзённасць” (с.303—527) — пачынаецца артыкулам дактаранта Варшаўскага ўніверсітэта П.Маеўскага “Праграма і арганізацыя “грамадзянскай барацьбы” польскага акупіраванага грамадства”. Істотным момантам у такой паўсядзённай барацьбе аўтар лічыць тое, што польскае насельніцтва ва ўмовах жорсткай германскай акупацыі “чэрпала сілы для выжывання ў дзейнасці падпольных арганізацый”, у патрыятызме і салідарнасці змагароў, у веры ў будучае сваёй краіны і такім чынам гартавала свой характар у барацьбе. Калі П.Маеўскі звяртаецца да тактыкі і сродкаў выжывання польскага насельніцтва, то кіраўнік аддзела Гданьскага інстытута нацыянальнай памяці Я.Маршалек раскрывае рэальную паўсядзённасць акупіраванага грамадства ва ўмовах германскага тэрору. Непасрэдна ў гістарычным цэнтры Польшчы — у раёнах Любліна, Кельцаў, Ржэшава — у другой палове 1943 г. становішча было надзвычай складанае. Ні нацыянальныя пытанні, ні праблемы дзяржаўных меж не здолелі аслабіць супраціўлення насельніцтва, салдаты Арміі Краёвай прайшлі складаныя выпрабаванні ва ўмовах тэрору германскіх акупантаў, з аднаго боку, і пастаянна ўзрастаючых канфліктаў з савецкімі партызанскімі фарміраваннямі — з другога.

Вядомы даследчык праблем Халакосту М.Дзін на аснове дакументаў і матэрыялаў судовых працэсаў у Польшчы і Савецкім Саюзе супраць "здраднікаў радзімы" паказвае ўдзел палякаў у стварэнні добраахвотнай паліцыі. М.Дзін прыводзіць прыклады беспаспяховых намаганняў германскіх службаў бяспекі стварыць этнічна аднародныя паліцэйскія службы. Аўтар абгрунтаваў той факт, што "не менш за 10 працэнтаў паліцэйскіх у Беларусі былі палякі". Рэчаіснасцю сталі паўсядзённыя злачынствы. На думку аўтара, да міфаў пра адносіны Арміі Краёвай і савецкага партызанскага руху можна аднесці сцвярджэнне, што і тыя, і другія вялі барацьбу супраць мясцовых паліцэйскіх. Тэма непасрэднага ўдзелу польскіх паліцэйскіх фарміраванняў у забойствах яўрэяў на тэрыторыі Усходняй Польшчы застаецца пакуль што недастаткова распрацаванай.

Адносіны каталіцкай царквы да Арміі Краёвай аналізуе прафесар тэалогіі Катавіцкага універсітэта Е.Мішор на аснове дзейнасці асобных прадстаўнікоў польскага духавенства. Маштабы ўдзелу ў падпольнай барацьбе польскіх жанчын разглядае настаўніца гімназіі г. Бадэн-Бадэна К.Хёгер. Дакладныя прыклады такога ўдзелу яна знаходзіць у гісторыі Варшаўскага паўстання, падчас якога жанчын можна было бачыць у "класічна жаночых ролях" санітарак, медсясцёр. В.Беднарскі малюе "твар вайны на прыкладзе абшчыны Котліцы", дзе польска-ўкраінскія супярэчнасці з 1944 г. перараслі ў адкрыты ваенны канфлікт.

Навуковы супрацоўнік універсітэта бундэсвера ў Гамбургу Л.Йокхек паказвае, як адлюстроўвалася дзейнасць польскага супраціўлення і Арміі Краёвай у афіцыйнай прапагандзе і друку на тэрыторыі генерал-губернатарства. Гэта інфармацыя ў гады акупацыі знаходзілася пад кантролем нацысцкай прапагандысцкай машыны, таму ўдзельнікі польскага супраціўлення называліся не інакш як "бандыты", "тэрарысты", "агенты". Пра ацэнку Варшаўскага паўстання салдатамі вермахта ідзе размова ў артыкуле дактаранта Базельскага універстэта А.Стэфан, якая знайшла пацвярджэнне таму, што існавала прынцыповае разыходжанне ў ацэнцы дзейнасці Арміі Краёвай нацысцкай прапагандай і салдатамі вермахта. Заключны артыкул раздзела Б.К'яры прысвечаны лакальным ваенным кантактам ці асобным фактам ваеннага ўзаемадзеяння Арміі Краёвай і вермахта на мяжы 1943—1944 гг.

У трэцім раздзеле кнігі — "Рэгіёны, меншасці і нацыянальнае пытанне па-за межамі Польшчы" (с. 531—676) — аўтары раскрываюць асаблівасці рэгіянальнай, канфесіянальнай, моўнай і палітычнай самаідэнтыфікацыі польскага насельніцтва ва ўмовах ваеннага супрацьстаяння і нацыянальных эксцэсаў. Г.Матэйка і Ц.Шнайдэр спыняюцца на польска-ўкраінскіх супярэчнасцях на тэрыторыі Падолля, Усходняй Галіцыі і Заходняй Украіны ў гады другой сусветнай вайны, П.Нівінскі — на нацыянальных пытаннях у Віленскай акрузе. Ф.Гальчэўскі акцэнтуе ўвагу на адносінах паміж прадстаўнікамі польскага падпольнага супраціўлення і яўрэйскімі ўзброенымі групамі падчас паўстання ў Варшаўскім гета.

Асаблівы інтарэс для айчыннага чытача прадстаўляюць 3 навуковыя артыкулы, прысвечаныя беларускаму рэгіёну. Супрацоўнік Варшаўскай рады па захаванні памяці загінуўшых змагароў К.Краеўскі дае агульную характарыстыку ваяводству Навагрудак. Плошча яго да пачатку вайны ў 1939 г. складала 22 966 кв.км, тут пражывалі 1 055 147 чалавек, у тым ліку ў Баранавічах — 36 тысяч і Лідзе — 30 тысяч чалавек, па-польску размаўлялі 553 859 чалавек, па-беларуску — 413 466, да яўрэяў адносіліся 74 025 чалавек. Аўтар адзначае, што ў ваяводстве Навагрудак адсутнічала прамысловасць, за выключэннем апрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і дрэваапрацоўкі, 29 працэнтаў тэрыторыі акругі займалі лясы. К.Краеўскі разглядае пачатковы этап вайны (1939—1941 гг.), структуру, арганізацыю і баявыя дзеянні Арміі Краёвай, палітыку германскіх устаноў, савецкі партызанскі рух у акрузе Навагрудак і яго ўплыў на польскае насельніцтва і Армію Краёву і інш.

Прафесар Гродзенскага універсітэта І.П.Крэнь даследуе дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі, якая на працягу доўгага часу з'яўлялася "белай плямай" для беларускіх гісторыкаў і чытачоў. Для ўсебаковага раскрыцця пастаўленай праблемы І.Крэнь прапануе агляд беларускай гістарыяграфіі па праблеме польскага падполля і заключае, што на сённяшні дзень у гістарычнай навуцы ёсць патрэба ў "шырокай дыскусіі на аснове дакументаў і сведчанняў відавочцаў". Апрача таго, І.Крэнь разглядае пытанні гістарычнага станаўлення беларускай дзяржаўнай мяжы, афіцыйнага стаўлення да польскай спадчыны ў Беларусі. У заключэнні аўтар канстатуе, што ў вывучэнні дзейнасці Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі "за апошнія гады дасягнуты значныя поспехі".

Выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка С.П.Барадзін прапануе артыкул на тэму "Беларуская гістарыяграфія і публіцыстыка і Армія Краёва ў паўночна-ўсходніх абласцях Рэспублікі Польшча ў 1939—1945 гг.". Зыходнымі момантамі для разгляду праблемы аўтар лічыць, па-першае, той факт, што да Патсдамскай канферэнцыі польскія паўночна-ўсходнія вобласці адносіліся дэ-юрэ да Польшчы і толькі са жніўня 1945 г. — да БССР, па-другое, сярод навуковых прац беларускіх даследчыкаў асаблівае значэнне маюць работы А.Літвіна, Л.Скрабінай, У.Барабаша і А.Хацкевіча, па-трэцяе, для большасці апублікаваных артыкулаў і кніг характэрна тое, што ацэнка дзейнасці Арміі Краёвай складвалася "пад моцным уплывам прапаганды і эмацыянальнасці".

С.Барадзін аспрэчвае шэраг пастулатаў савецкай гістарыяграфіі, прапануе нямецкамоўнаму чытачу свае погляды на пытанні аб юрыдычных аспектах дзейнасці Арміі Краёвай на "крэсах усходніх" і на перыядызацыю яе гісторыі ў Беларусі, аб ацэнцы польскай гістарычнай навукі, аб падтрымцы мясцовымі палякамі Арміі Краёвай і савецкіх партызан і раззбраенні фарміраванняў гэтай падпольнай арганізацыі ў акругах Вільна і Навагрудак савецкімі партызанамі і інш.

С.Барадзін лічыць, што беларускія гісторыкі часцей за ўсё "атаясамліваюць інтарэсы беларускага народа з палітыкай сталінскага кіраўніцтва". Таму барацьба супраць польскай падпольнай арміі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Польшчы з'яўлялася "выключна элементам знешняй палітыкі СССР", мэтай якой было "падпарадкаванне і саветызацыя дзяржаў Сярэдняй і Усходняй Еўропы". Як заўважае аўтар, да сённяшняга дня ў беларускай гістарыяграфіі выкарыстоўваецца "старая версія гісторыі часоў Л.Цанавы". С.Барадзін перакананы, што вывучэнне гісторыі Арміі Краёвай у Беларусі толькі пачынаецца.

Заключны раздзел кнігі — "Гістарычныя карціны аб Арміі Краёвай у пасляваеннай Польшчы" (с. 679—861) — прысвечаны пытанням, як ствараўся міф пра Армію Краёву, якую ролю ён адыграў у гісторыі Польскай Народнай Рэспублікі. К.Камароўскі вядзе размову пра ваеннае значэнне форм падпольнай барацьбы Арміі Краёвай і магчымасці аднаўлення былых ваенных традыцый у польскіх узброеных сілах для вырашэння сучасных ваенных задач. Пра значэнне гісторыі падпольнай арміі для ўзброеных сіл пасляваеннай Польшчы разважае намеснік Цэнтральнага ваеннага архіва ў Варшаве А.Ч.Жак. Лёс ветэранаў Арміі Краёвай зацікавіў К.Лесякоўскага. Ён паказвае крокі польскага грамадства ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі па шляху да сапраўднага асэнсавання ролі былых салдат Арміі Краёвай у барацьбе супраць нямецкіх акупантаў. Дацэнт Навукова-літаратурнага інстытута пры Польскай акадэміі навук Р.Габільскі працягвае гэту тэму і прысвячае свае пошукі асэнсаванню ролі былых салдат Арміі Краёвай у грамадскім жыцці польскай эміграцыі. Супрацоўнік Варшаўскага фонду нямецка-польскага супрацоўніцтва Т.Маркевіч распавядае пра гісторыю Арміі Краёвай як аднай з самых вялікіх узброеных падпольных арганізацый. Пра гэта сведчаць устаноўленыя ў польскіх гарадах, вёсках, цэрквах і ў грамадскіх месцах помнікі, памятныя дошкі, крыжы і іншыя знакі памяці пра ўзброеную барацьбу і страты Арміі Краёвай.

Навуковы супрацоўнік Інстытута палітычных даследаванняў пры Польскай акадэміі навук Р.Унук заключае, што менавіта пазітыўная карціна дзейнасці Арміі Краёвай як арганізацыі, якая змагалася за свабоду і дэмакратычныя каштоўнасці, садзейнічала ў значнай меры ўзнікненню супраціўлення "камуністычнаму рэжыму". Э.Дмітроў у сааўтарстве з Ю.Кулаком звяртаецца да шматгадовай дыскусіі польскіх гісторыкаў пра тое, якую ролю адыграла Армія Краёва ў гісторыі Польшчы ў 1939—1945 гг. Аўтары прыходзяць да высновы, што гісторыя Арміі Краёвай стала крыніцай духоўных сіл для палякаў, паколькі яна пераканаўча паказвае, якія каштоўнасці для народа з'яўляюцца важнейшымі (годнасць, гонар, свабода, незалежнасць, палітычны і культурны суверэнітэт, дзяржаўная непадзельнасць і дэмакратычныя каштоўнасці), якой пазіцыі і дзейнасці патрабуе польскі патрыятызм (мужнасці, бескампраміснасці, бязмежнай гатоўнасці да ахвяравання і вернасці, веры, настойлівасці, салідарнасці). Аўтары заключаюць, што "адносна правільнага стаўлення да вышэйшых каштоўнасцей народа Армія Краёва адыграла ў гісторыі ключавую ролю". У апошнім артыкуле чацвёртага раздзела, аўтарам якога з'яўляецца прафесар Варшаўскага універсітэта Б.Шчака, прапануецца сацыялагічны аналіз гісторыі Арміі Краёвай у "польскай калектыўнай памяці", для чаго выяўляецца роля, месца і значэнне гэтай арміі, якая стала феноменам у польскай ваеннай гісторыі.

Завяршаюць кнігу дадаткі — храналогія гісторыі Арміі Краёвай з 26/27 верасня 1939 г. да 1 ліпеня 1945 г., фотаздымкі, карты, імянны паказальнік і бібліяграфія Арміі Краёвай з 1945 па 2002 год, спіс скарачэнняў.

Ёсць усе падставы зрабіць высновы, што перад намі надзвычай змястоўная, цікавая і грунтоўная калектыўная праца па шэрагу малавядомых ці спрэчных пытанняў гісторыі Арміі Краёвай. Шкада, што для значнай большасці айчынных чытачоў новае нямецкамоўнае выданне застаецца пакуль што па-за межамі грунтоўнага навуковага аналізу.

**Сяргей Новікаў,**
*загадчык кафедры*
*гісторыі і беларусазнаўства Мінскага*
*дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта,*
*кандыдат гістарычных навук.*